**У пачатку 2018 года выйшла ў свет кніга "Асоба: Котляр І.І." (аўтары С.А.Пцічкіна і А.М.Галоўчанка). Гэта вельмі правільная, дакладная і аб'ектыўная назва, бо Іван Іванавіч Котляр — вядомы грамадскі дзеяч, высокапрафесійны педагог, выдатны вучоны, асветнік — знакавая фігура сучаснага беларускага грамадства, чалавек асаблівай загартоўкі і лёсу. 20 гадоў назад ён стварыў і паспяхова кіруе і сёння рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем абароны правоў чалавека — Беларускай секцыяй міжнароднага таварыства правоў чалавека.**




# З верай у ідэалы

І.І.Котляра па праве можна назваць піянерам у сферы правоў чалавека ў сучаснай Беларусі. Ён першым сярод выкладчыкаў вышэйшай школы краіны правёў у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С.Пушкіна навукова-педагагічны эксперымент (1994—1998 гг.), вынікам якога стала стварэнне ў Рэспубліцы Беларусь сістэмы адукацыі ў галіне правоў чалавека. У 1996 годзе выдаў дапаможнікі "Правы чалавека" і "Правы чалавека. Сучасныя ўяўленні і механізмы абароны". Яны былі першымі ў краіне навукова-метадычнымі выданнямі па праблеме правоў чалавека.

У 1996 годзе І.І.Котляр першым сярод навуковай грамадскасці выступіў з прапановай аб увядзенні ў сістэму адукацыі вучэбных курсаў па правах чалавека. У 1998 годзе выканаў заданне Міністэрства адукацыі аб напісанні праграмы вучэбнага курса "Правы чалавека" для УВА краіны. Да выдатных заслуг вучонага варта аднесці распрацаваную ім навукова-тэарэтычную канцэпцыю правоў чалавека, у аснове якой правы чалавека разглядаюцца як з'ява сусветнай культуры і цывілізацыі, а не толькі як палітычная або юрыдычная праблема.

І.І.Котляр валодае выдатнымі арганізатарскімі якасцямі. З 1996 па 2017 год ён падрыхтаваў і правёў шэраг рэспубліканскіх і міжнародных тэарэтычных і навукова-практычных канферэнцый па правах чалавека. Ён з'яўляецца аўтарам 215 навуковых, навукова-метадычных і навукова-папулярных работ, якія па заслугах былі ацэнены ў 2003 годзе, калі Вышэйшая атэстацыйная камісія Рэспублікі Беларусь прысвоіла яму званне "прафесар паліталогіі".

Здзіўляе яго працаздольнасць, мэтанакіраванасць і глыбокая вера ў ідэалы правоў чалавека. Ён жыве па законах сумлення, справядлівасці, у адпаведнасці з прынцыпам "лепш запаліць адну свечку, чым увесь час праклінаць цемру". Увесь свой назапашаны вопыт і веды ён спрабуе перадаць моладзі. Гэта і напісанне студэнтамі навуковых работ пад кіраўніцтвам педагога, і арганізацыя навуковых студэнцкіх канферэнцый з публікацыяй іх вынікаў, і цікавыя творчыя лекцыі і семінарскія заняткі.

Як высакакласны спецыяліст прафесар Котляр неаднаразова запрашаўся на парламенцкія слуханні ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па праблемах правоў чалавека, амбудсмена і смяротнага пакарання.

Навуковая, праваабарончая і педагагічная дзейнасць прафесара І.І.Котляра атрымала міжнароднае і рэспубліканскае прызнанне. У 2001 годзе ён быў узнагароджаны Ганаровым дыпломам Міжнароднага біяграфічнага цэнтра ў Кембрыджы (Вялікабрытанія). Біяграфічныя даныя пра вучонага і педагога апублікаваны ў многіх айчынных і замежных энцыклапедычных выданнях. Навуковец і педагог узнагароджваўся граматамі рэспубліканскага парламента, Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта, рэктарата Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна, атрымліваў падзячныя лісты ад прадстаўніцтва ААН у Беларусі.

Педагога і вучонага І.І.Котляра добра ведаюць ва ўсіх вышэйшых навучальных установах рэспублікі, таму што яго вучэбныя і метадычныя дапаможнікі, матэрыялы канферэнцый, семінараў і круглых сталоў па правах чалавека ёсць у кожнай бібліятэцы. Ён актыўна выступае з лекцыямі перад студэнтамі ва ўсіх вядучых УВА, супрацоўнічае з рэспубліканскімі сродкамі масавай інфармацыі.

Аднак не ўсё так проста і гладка складалася ў яго жыцці. Пра тое, якой цаной былі дасягнуты вялікія вынікі, таксама расказваецца ў кнізе. Першаму заўсёды цяжка.

Пакуль не ўсе ідэі прафесара І.І.Котляра прыняты і рэалізаваны ў нашым грамадстве па розных прычынах. У сістэме вышэйшай адукацыі да гэтага часу няма лабараторый і кафедраў па вывучэнні правоў чалавека, адсутнічае тэхнічная і фінансавая база для навукова-даследчай работы і інш.

Нягледзячы на гэта, сваёй перакананасцю, мэтанакіраванасцю і глыбокай верай у вышэйшыя гуманістычныя ідэалы прафесар І.І.Котляр запаліў не адну, а мноства свечак, у тым ліку і мяне, аўтара гэтых радкоў. Мне пашчасціла сустрэцца і затым плённа супрацоўнічаць з ім больш за дваццаць гадоў. Гэта вельмі разумны, сціплы, прыстойны і сумленны чалавек, які, як магніт, прыцягвае да сябе іншых людзей.

Перакананы, што вопыт працы прафесара І.І.Котляра на ніве навучання правам чалавека і навуковага асэнсавання гэтага феномена сусветнай цывілізацыі павінен быць распаўсюджаны і ў поўнай меры выкарыстаны такімі міжнароднымі арганізацыямі, як ЮНЕСКА, Міжнароднае таварыства правоў чалавека, Нацыянальная акадэмія Беларусі.

Прафесар І.І.Котляр — гэта ўвасабленне лепшых чалавечых якасцей, сумленне айчыннай навуковай інтэлігенцыі, выбітная асоба і наша нацыянальнае багацце. Упэўнены, што ён зробіць яшчэ шмат на карысць Айчыны.

**Сяргей СІМАНОЎСКІ,**
**дацэнт БДУ, кандыдат філасофскіх навук.**